Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 5(339) 11 ЛЮТАГА 1998 г.

Інфармацыйнае поле

Чатыры тыдні ў студзені.

Прыватны агляд беларускіх mass-media.

***"Наша Слова"**: Вынікі падпіскі і продажу;*
***"Спадчына "** №№ 4.6: сп. Грынкевіч "У братоў украінцаў";*
*Каляндар газеты **"Царква"** за 1998 год.*

Нечакана для мяне гэты першы агляд беларускай інфармацыйнай прасторы прысвечаны перш за ўсё публікацыям таго самага выдання, ў якім, я спадзяюся, ён пабачыць свет. Але гэта, па маім перакананні, матэрыял асаблівай важнасці. "Наша Слова" ў студзені здабылося на інфармацыйны ўчынак рэвалюцыйнага характару.

Упершыню я ўбачыў на старонках газеты шчырую інфармацыю пра яе распаўсюджанне, прычым, далёка не самую прыемную для рэдакцыі! Упершыню праблема колькасці прыхільнікаў Беларушчыны вынесеная імі самімі на публічны разгляд у выглядзе канкрэтных лічбаў. Я вітаю рэдактара і рэдакцыю і дзякую ім за гэты мужны крок. Нарэшце садраныя пакровы з супольных нашых грахоў, нанесены рашучы ўдар па мовафільскіх міфах, знойдзены годны адказ на эмацыйныя выгукі і слязлівыя заклікі.

Як рэферэндум 1995 году выявіў, што выдатна давёў у свой час, здаецца, С.Дубавец, мільённую сацыяльную базу прыхільнікаў Беларушчыны і назалежнасці, так зместкі "Нашага Слова" дэманструюць нам усю нішчымнасць нібыта найбольш актыўнай часткі гэтага мільёна.

Я пішу пра гэта , каб заклікаць чытачоў газеты: не сумуйце! Гэта шчасце, што нарэшце мы ўведалі яшчэ адзін неабходны нам кавалачак праўды. Гэта цудоўна, што развеяўся ружовы туман. Нічога ж на самай справе не змянілася, а туман, ружовы ён, ці не, замінае ісці да мэты.

Дарэчы, нарыс з 1936 году, які мы маглі дачытаць у гэтым месяцы ў "Спадчыне", даў нам выразны прыклад цвярозага падыходу. Мне даўно здавалася, што і міжваенны перыяд, і гісторыя, нашых паўднёвых суседзяў дарма застаецца па-за нашай увагаю (або нездарма схаваныя ад нас), але ў цемнаце сваёй я не ўяўляў, колькі мы губляем з гэтае прычыны.

У тыя далёкія часы, як сведчыць нарыс сп. Грынкевіча, сабраны быў бясцэнны для нас сёння досвед жыцця ва ўмовах хай вельмі недасканалага, але ўсё ж нетаталітарнага ладу. Гэта досвед працы і самаарганізацыі, веданне меры часу і высілкаў, патрэбных для зменаў у грамадскіх дачыненнях. Гэта шматлікія ўзоры поспехаў і памылак у развязванні такіх спраў, якія сёння зноў стаяць перад намі.

Гэты самы матыў повязі праз дзесяцігоддзі азваўся зноў, калі каляндар газеты "Царква" заняў сваё месца на сцяне. Ажывае старая, адраджэнцкая традыцыя беларускіх календароў.

Не ведаю чаму, але беларускае слова ў календары радуе мяне нават болей, чым у кнізе ці газеце.

Выданне "Царква" радуе да таго ж добрай паліграфіяй, высакароднымі тэкстамі, стараннай падрыхтоўкай. З Новым Годам!

Д.Жукоўскі.

Знаёмцеся з геральдыкай

Без паперкі ты ... Бессмяротнае прыходзіць на памяць, калі бачыш на вітрыне грозны шэраг пячатак і адбіткаў па сургучы. Але не славутай гісторыі бюракратычнага апарату, адной з дэталей якога з'яўляецца пячатка, прысвечана пастаянная выстава ў Гістарычным музеі, а старыжытнай геральдыцы Беларусі. Геральдычныя сімвалы выяўлены не толькі на пячатках прыватных, земскіх, канфесійных і адміністрацыйных, але і на манетах Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, кафлі і ў раскопках Заслаўя і Магілёва XVI-XVII ст.ст., на старажытных кнігах і дакументах.

І, зразумела, гярбы, быццам бы сыйшоўшыя з тарчаў беларускіх драбаў, якія нішчаць ворагаў пад Грунвальдам і Смаленскам.

Як і чалавек, герб мае ўласнае імя, якое можа ўтварыцца ад мянушкі— "Драгаслаў", ад баявога покліч — "Даленга", ад жывёлы, стаўшай сімвалам мужнасці і сілы — "Ястраб". Але не толькі шляхта мела свае гярбы, а і гарады, кляштары і, нават, асобныя цэхі маглі ўзняць свой штандар з уласным гербам.

Стваральнікі выставы імкнуліся ахапіць практычна ўвесь перыяд беларускай геральдыкі, пачынаючы "драгічынскімі пломбамі" XIV ст. і заканчваючы сучаснымі работамі мастакоў, але якія адлюстроўваюць усю тую ж старажытную сімволіку.

У выставе не знайшлося месца сімвалам, створаным у савецкі час. Занадта вялікі дысананс атрымаўся б у выніку.

Хаця выстава і невялікая, але будзе даволі цікавая для тых, каму не ўсё роўна, чым жылі нашы прашчуры і што пакінулі ў спадчыну нашчадкам.

Кухта Ул., Вайцяховіч А.
студэнты БУКа

супрасль

Што чакае кляштар у Супраслі?

У канцы XV ст. сярод глухіх лясоў Белавежскай пушчы вядомыя беларускія дзеячы сярэднявечча вялікі гетман літоўскі Аляксандр Хадкевіч і смаленскі епіскап Язэп Солтан заснавалі Супраслеўскі кляштар. Неўзабаве, у пачатку XVI ст. тут быў збудаваны адзін з шэдэўраў беларускай мураванай готыкі - абарончы чатырохвежавы храм імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

Царква ўзводзілася ў гады актыўных ваенных дзеянняў Вялікага княства Літоўскага з Рускай дзяржавай і крымскімі татарамі. Якоаз тады назіраецца інтэнсіўная пабудова фартэцаў у суседніх Беластоку, Тыкоціну, Кнышыну і іншых гарадах. Сам А. Хадкевіч будуе ў Гарадку ўмацаваны замак і ўласныя харомы, а ў 1510 г. заканчвае ўмацаваную Супраслеўскую царкву, значэнне якой ён недвухсэнсоўна падкрэсліў у сваёй грамаце: "Абы тот монастырь... на нашей отчизне твердо на веки стоял нашим споможением".

Вядомы даследчык беларускай гісторыі і архітэктуры, прафесар Міхась Ткачоў у сваёй манаграфіі "Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII-XVIII ст.ст." адзначаў, што "Супраслеўская царква, бяспрэчна, займае выдатнае месца сярод тых 4-х вежавых будынкаў, у якіх свае-асаблівы архітэктурны стыль беларускай готыкі знайшоў сваё поўнае праяўленне. Будынак з'яўляецца яркім узорам сінтэтычнасці гэтага стылю, які ўдала спалучаў усе папярэднія асновы грамадзянскай і ваеннай архітэктуры. Ён дазваляе ўбачыць, з якіх элементаў вырас і выкрышталізаваўся новы архітэктурны стыль і праз якія папярэднія этапы развіцця прайшло старажытнае беларускае дойлідства.

Нарэшце , Супраслеўскі храм мае важнае значэнне ў вырашэнні пытання генэзы 4-вежававга абарончага храма на Беларусі, у вызначэнні канкрэтнага месца ўзнікнення першага такога будынка". Беларускі вучоны лічыў, што першым такім храмам была Полацкая Сафія, перабудаваная ў абарончы храм у канцы XV ст.

З дапамогай сербскіх мастакоў інтэр'еры гэтай царквы былі распісаны ўнікальнымі фрэскамі. Аднак у 1944 годзе храм быў узарваны і ад яго засталіся толькі падмуркі. Рэшткі фрэсак былі выстаўлены ў мясцовым музеі, што знайходзіўся ў кляштары. Амаль усе будынкі кляштара пасля вайны належалі дзяржаве і паступова прыйшлі ў заняпад.

Пасля аднаўлення дэмакратыі ў Польшчы, мясцовае праваслаўнае насельніцтва за свае сродкі пачало аднаўляць гатычны храм XVI ст. (работы ўжо зроблены на дзве трэці) і ставіць пытанне пра вяртанне праваслаўнай царкве Польшчы ўсіх будынкаў кляштара.

Пад час візіту Станіслава Шушкевіча ў Польшчу летам 1992 г. гэта ініцыятыва была падтрымана беларускай дзяржавай, а былы кіраўнік Гарадзенскай вобласці Дзмітры Арцюменя аказаў канкрэтную матэрыяльную дапамогу з боку вобласці для аднаўлення беларускага музея ў Гайнаўцы і кляштара ў Супраслі.

Справа пра вяртанне будынкаў кляштара ішла вельмі марудна, аднак у 1996 г. увесь Супраслеўскі кляштарны комплекс перайшоў у валоданне праваслаўнай царквы. Улічваючы дрэнны стан кляштарных будынкаў, польскі урад, а дакладней тагачасны яго прэм'ер-міністр, 15 кастрычніка 1997 года, прыняў змеркаванне пра выдзяленне 600.000 новых злотых на тэрміновы рамонт кляштарнага корпуса.

Але новы кіраўнік польскага ўрада нядаўна змеркаваў скараціць гэтую суму напалову, спасылаючыся на вельмі неспрыяльны год для Польшчы з акалагічнага гледзішча. Адначасова ў прэсе з'явіліся публікацыі пра тое, што гэта "адплата беларускаму электарату", а дакладней пакаранне яго за тое, што беларусы ў асноўным галасуюць за левых польскіх палітыкаў. (Былы прэм'ер сацыял-дэмакрат, а сённяшні - прадстаўнік правага крыла Салідарнасці).

Гэтая сітуацыя выклікала напісанне 20 студзеня 1998 года вядомымі беларускімі і ўкраінскімі дзеячамі Польшчы адкрытага ліста да кіраўніка польскага ўрада з просьбаю адмяніць гэтае несправядлівае змеркаванне.

Я спадзяюся, што грамадскасць Беларусі патрымае гэтую ініцыятыву нашых беластоцкіх сяброў, а ўрад Беларусі, які так шчодра аплочвае розныя "Славянскія базары", знойдзе нейкую прыстойную суму грошай для падтрымкі аднаўлення аднаго з буйнейшых помнікаў сярэднявечнай усходнеславянскай культуры - кляштара ў Супраслі.

А.Трусаў,
кандыдат гістарычных навук

БЕЛАСТОК, дня 20 студзеня 1998 г.

Адкрыты ліст да прэм'ера Рэчы Паспалітай Польскай Ежы Бузка

На нашай Бацькаўшчыне побач з мноствам справаў, якія вымагаюць развязку і змеркавання мае месца таксама і праблема адраджэння Супраслеўскага кляштара.

Кляштар у Супраслі , зафундаваны ў 1498 годзе праваслаўным магнатам Рэчы Паспалітай, вялікім гетманам літоўскім Аляксандрам Хадкевічам і архіепіскапам смаленскім Язэпам Солтанам на вечна быў і з'яўляецца зараз для людзей, якія тут жывуць: русінаў - як называлі іх у мінулым, зараз беларусаў і ўкраінцаў, духоўным і культурным цэнтрам. Так было спачатку, пакуль ён быў праваслаўным, пазней, калі стаў вуніяцкім і калі зноў вярнуўся да праваслаўя.

Нажаль лёс гэтага ўнікальнага помніка гісторыі ў XX стагоддзі быў трагічны. У 1944 годзе нямецкія войскі пры адступленні разбурылі галоўную святыню кляштара - царкву Звеставанне Найсвяцейшай Дзевы Марыі, а дзяржаўныя інстытуты, якія адказвалі за стан аб'екту - з 1996 года ён быў уласнасцю дзяржавы - апошнія дзесяць гадоў не рабілі нічога, каб стрымаць яго заняпад. Тыя , хто павінны былі трымаць апеку над аб'ектам, не спадобіліся нават на такія элементарныя праявы клопату, як прачыстка забітай трубы, ці замацаванне адарванай дахоўкі. У выніку праваслаўнай царкве былі вернуты будынкі, якія затапляліся вадой, з мокрымі, пакрытымі плесенню сценамі, няспраўным начыннем. Учыненная шкода, якой можна было яшчэ пяць год таму назад пазбегнуць за невялікія грошы, зараз цягне на мільёны.

Цяжар выратавання каштоўнага помніка гісторыі лёг на праваслаўных людзей, якія ў большасці сваёй засяляюць так званую ўсходнюю сцяну, дзе матэрыяльнае становішча , у параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны, значна горшае. Таму кожная дапамога, кожны жэст, які служыць адраджэнню Супраслеўскай лаўры, успрымаецца ў нашым асяроддзі з вялікай надзеяй і радасцю. Так было ўспрынята змеркаванне прэм'ера ўраду РП ад 15.X.1997 года наконт выдзялення 600.000 злотых прызначаных для выканання найпільнейшых работаў (замена дахаў) у будынках Супраслеўскага кляштара.

Вы, пане прэм'ер, змеркаваннем ад снежня леташняга года зменшылі згаданую суму на палову. Змеркаванне ў праваслаўным асяроддзі выклікала здзіўленне і пачуццё крыўды. Здзіўленне, таму што ў той час, калі асяродкі нацыянальных меншасцяў звязвалі з заняццем Вамі пасады прэм'ера надзею на лепшае разуменне іхніх праблемаў, цяжка было паверыць, што Вы пойдзеце следам за мясцовымі палітыкамі, якія нават святую для нас справу адраджэння Супраслеўскай лаўры выкарысталі, як сродак для барацьбы з палітычнымі супраціўнікамі. Лідар беластоцкай Выбарчай акцыі Салідарнасці факт дапамогі адышоўшага ўрада вызначае,як плату беларускаму электарату за галасы на апошніх выбарах .

Узнікае пытанне, каб дапамога была выдзелена раней, ці не было б гэта ацэнена як "купля" галасоў. Нажаль, такі стэрэатып спасціжэння праблемаў меншасці распаўсюджаны сярод значнай часткі беластоцкіх дзеячоў ВАС.

Вынікам з'яўляецца антаганізацыя грамадства і пачуццё крыўды сярод меншасцяў, што насяляюць наш рэгіён.

Сваім змеркаваннем , верым, што не наўмысным, Вы прычыніліся да замацавання таго стэрэатыпу. "Кара" - бо мепенавіта так успрынята гэтае змеркаванне, якая наносіць вытненне ў сферы культуры і веры праваслаўнай меншасці, не служыць на карысць дэкларыраваных Вамі прынцыпаў і каштоўнасцяў.

Пасля пераломнага 1989 года найвышэйшыя ўлады рэспублікі шматкротна аказвалі дапамогу касцёлу, у першую чаргу касцёлу рымска-каталіцкаму. Аднак ніколі гэтаму не надавалася палітычнага кантэксту, які антаганізаваў бы людзей розных веравызнанняў. Таму мы супраць спробаў выкарыстання нас і важных для нас спраў у палітычнай гульні.

Пан Прэм'ер!

У 1577 годзе знакаміты гісторык Вялікага Княства Літоўскага Мацей Стрыйкоўскі пісаў : ***"Калі б гісторыя, якая з'яўляецца сведкай дзіўных рэчаў, была занядбана і ў нішто ператворана, то жыццё людское мала бы рознілася ад немай жывёлы (якая не мае нічога любшага, акрамя роскашаў цялесных) і бясмяротнасць душы з добрай славаю за добрыя справы ўжо б згінула... Знікаюць дзяржавы, пераходзяць ад народа да народа манархіі, нішчацца рознымі выпадкамі каралеўствы, у нішто ператвараюцца скарбы. Але гісторыя ... не згіне ніколі, і таму справы і дзеі ўсе вечнасці і бясмерцю аддавайце так, каб у сэрцах і памяці простых, невучоных людзей ад самага слухання трываць застацца маглі".***

Супрасль, будучы асяродкам рэлігійнага і культавага жыцця ў Польшчы, з'яўляецца таксама і сведкам дзіўных рэчаў, помнік часоў шматнароднай і талерантнай Рэчы Паспалітай, з'яўляецца сімвалам вечнасці і бясмяротнасці, які і ў рэальным і ў містычным вымярэнні дапамагае адрозніць людзкое жыццё ад немай жывёлы. Бо гэта месца, значэнне якога не абмяжоўваецца адбудаванай пасля варварскага знішчэння святыняй. Мы павінны ўталкаваць значэнне такіх месцаў як Супрасль кожнаму паляку і еўрапейцу, бо яно з'яўляецца відавочным знакам трываласці спраў духоўных, заахвочваенм да ўзаемнага пазнання рэфлексіі над сабой і іншымі , спосабам перамогі над неталерантнасцю і ксенафобіяй, эксклюзівізмам культурным, рэлігійным ці грамадскім. Знікаюць дзяржавы, але не Супраслі, якія павінны трываць і пра якія павіны памятаць, бо яны гарантуюць " бесмяротнасць душы і добрую славу за добрыя справы".

Вялікі цяжар адбудовы Супраслеўскай лаўры кладзецца перш за ўсё на простых, невучоных людзей. Гэта дзякуючы іх ахвярнасці справа адбудовы галоўнай святыні кляштара набліжаецца да канца.

Верым, што і засталая частка лаўры, незалежна ад змеркавання і стасунку "моцных гэтага свету", будзе ўратавана.

Ад імя праваслаўных абываценяў Рэчы Паспалітай Польскай просім Вас пра адмену змеркавання і прызначэння Супраслеўскай лаўры датацыі ў першапачатковым памеры.

Ліст падпісалі:

Яўген Чыквін, старшыня Таварыства Славянскай меншасці Народнай Рэчы Паспалітай Польскай - Праваслаўнай;
Яраслаў Вярдні, старшыня брацтва царкоўнага св. Міколы ў Беластоку;
Ян Сычэўскі - старшыня галоўнай рады Беларускага агульна-культурнага таварыства;.
Сакрат Яновіч - польска- беларускі пісьменнік;
Прафесар Міхаіл Малафееў, старшыня Усяпольскага праваслаўнага брацтва св.св. Кірыла і Мяфодзія;
Уладзімір Місіюк - генеральны сакратар Сусветнага брацтва праваслаўнай моладзі;
Пётр Крук - старшыня Галоўнай рады Беларускага дэмакратычнага задзіночання;
Прафесар Анатоль Адзіевіч - старшыня таварыства "Русь";
Алег Латышонак - старшыня Беларускага гістарычнага таварыства;
Яўген Вапа, старшыня Беларускага саюза ў Рэспубліцы Польша;
Ян Рошчанка, старшыня Саюза ўкраінцаў Падлясся;
Мікола Бушко, дырэктар міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі "Гайнаўка";
Юры Хмялеўскі, старшыня Таварыства беларускіх журналістаў, галоўны рэдактар "Часопіса";
Яўген Міpановіч, старшыня Праграмнай рады штотыднёвіка "Ніва";
Александр Васілюк, старшыня Брацтва праваслаўнай моладзі ў Польшчы.

і татары здзіўлены...

Пра тое, што баліць, людзі гавораць нават у час урачыстасцяў. Так было нядаўна і ў Гудах, калі грамадскасць адзначала 60-я ўгодкі дырэктара саўгаса "Лідскі" Мацея Крыніцкага. Да месца будзе адзначыць, што з самага пачатку вечарыны тут загучала мілагучнае беларускае слова. Перш-наперш з вуснаў вядомай на ўсю Лідчыну Марыі Сахонь, арганізатара і кіраўніка знакамітага сямейнага ансамбля музыкаў і спевакоў.

Добрае, узнёслае слова пра юбіляра сказаў старэйшы журналіст Гарадзеншчыны, былы рэдактар Лідскай аб'яднанай газеты "Уперад" А. Жалкоўскі, Алесь Васільевіч заўважыў наступнае:" Хоць Мацей Крыніцкі па веры і крыві татарын, ён душою беларус, чалавек, улюбёны ў наш край, быт і традыцыі яго людзей. Нездарма юбіляр цудоўна валодае беларускай і польскай мовамі".

У слове ў адказ Мацей Сцяпанавіч сказаў, што балюча перажывае пагардлівыя адносіны ў нашай дзяржаве да мовы беларусаў. "Манапольнае выкарыстанне расейскай мовы на Беларусі,— лічыць вядомы гаспадарчы кіраўнік, кандыдат сельскагаспадарчых навук, гэта нонсенс."Прасцей кажучы, недарэчнасць, бяссэнсіца.

Татары гэта разумеюць.Калі ж тое самае зразумеюць браткі-беларусы! Ці яны будуць чакаць на сваіх правадыроў, пакуль тыя навучацца матчынай мове.

А.Каліноўскі.

Вытанчанае слова ў гасцях у біяхімікаў

"Пісьменнікі за тры дні ў Гародні зрабілі болей, чым БНФ за паўгода", - сказаў Лявон Баршчэўскі. Безумоўна, ён трохі падлісліваў пісьменнікам, але 35 сустрэч гавораць самі за сябе. "Наша Слова" ўжо давала інфармацыю пра пісьменніцкі дэсант у Гародню. Сёння мы друкуем водгук яшчэ на адну з сустрэч.

22 студзеня ў Інстытуце біяхіміі адбылася сустрэча супрацоўнікаў з пісьменнікамі. Да біяхімікаў завіталі пісьменнік Уладзімір Арлоў, паэт Алесь Чобат ды літаратуразнаўца Алесь Пяткевіч. Госці чыталі свае творы, расказвалі пра творчыя планы, лёс сваіх кніг у выдавецтвах. Асаблівы рэзананс у аўдыторыі выклікалі творы, якія былі напісаны 7-8 гадоў таму, але зараз зрабілася зноў балюча актуальнымі.

Сабраляся шмат людзей. Нягледзячы на даволі нізкую тэмпературу ў залі, адчувалася вельмі цёплая і прыязная атмасфера сустрэчы. Ішла размова аднадумцаў і сяброў. У адносінах да беларускай культуры, гісторыі і мовы гродзенскія біяхімікі працягваюць справу заснавальніка Інстытута - акадэміка Ю.М. Астроўскага, які быў вучоным сусветнага ўзроўню, прызнаным аўтарытэтам у сваёй галіне навукі, але ніколі не забываўся на тое, што ён - беларус, заўсёды дбаў пра развіццё навукі на Беларусі, бо быў перакананы, што ў нас ёсць добрыя ўмовы для навуковай працы ды людзі, здатныя да яе, што менавіта развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу будзе спрыяць узмацненню Беларусі.

Сустрэча з пісьменнікамі садзейнічала падтрымцы навукоўцаў у справе развіцця духоўных каштоўнасцяў, бо вельмі нялёгка займацца інтэлектуальнай справай у абставінах "рынкавага сацыялізму". Пэўна, такія сустрэчы карысныя і неабходныя і пісьменнікам, і навукоўцам, і ўсім людзям, якіх турбуе лёс Радзімы, шляхі і кірункі далейшага развіцця нашага грамадства.

У пашырэнні такіх сустрэч, іх колькасці, складу слухачоў, каб у іх прымалі ўдзел і пісьменнікі, і мастакі, і настаўнікі, і інжынеры, і навукоўцы - адным словам, усе, хто дбае пра развіццё духоўных каштоўнасцяў на Беларусі, - бачыцца мне важкі напрамак дзейнасці ТБМ. Трэба сустракацца з людзьмі, каб пашыралася кола аднадумцаў і прыхільнікаў, каб яны атрымлівалі падтрымку адно ад аднаго, каб бачылі, што нас не так ужо і мала. Кожны зварот да людскіх душаў не застаецца без адказу, хай не адразу, але прарасце надзеяй ды добрымі ўчынкамі на карысць Бацькаўшчыны. Каб слабеў страх у душах, каб людзі задумваліся пра сённяшнюю лусту хлеба, але і пра тое, што застанецца пасля нас.

Н.П.Кануннікава,
Гародня.

Чаму неабходны яшчэ адзін слоўнік?!

Скажам так, прыкладам дзесяць гадоў таму назад нечакана-неспадзявана нават для саміх сябе шмат хто з нас павярнуўся тварам да Беларусі, беларускасці. Мы сталі цікавіцца яе далёкай мінуўшчынай, дый шукаць адказы на такія хвалюючыя пытанні, як, хто мы, адкуль пайшлі і дзе нашыя карані. Вывучэнне, даследванне ці хаця бы пабытовае азнаямленне з усім тым, што звязана з гэтымі пытаннямі запатрабавала больш дасканалага ведання беларускай мовы. Усё гэта выклікала да сталага ўжытку вялікае мноства спрадвечных беларускіх слоў; састарэлых, безпадстаўна забытых, прымусова заменены х на так званую кальку ў працэсе русіфікацыі. Такімі чыста беларускімі словамі звычайна карысталіся навукоўцы ды ў нейкай ступені пісьменнікі, паэты. Сродкі масавай інфармацыі і да гэтага часу карыстаюцца тым наркамаўскім правапісам і тым зрусіфікаваным вымаўленнем. Тлумачылася ўсё гэта тым, што так простаму народу лягчэй разумець сэнс сказанага ды напісанага на беларускай мове. Яно і сапраўды так, бо скажам зрабі пераклад бязтэмнага і неканкрэтнага выступу якога-небудзь генсека на сапраўдную беларускую мову чытачу будзе вельмі складана ў некаторых месцах усвядоміць сэнс гэтага бязглуздага казання.

Дагаджальніцтва, хай нават самому народу, нікому і ніколі не прыносіла карысці.

Як там не было, але працэс вяртання да беларускасці вярнуў нам столькі слоў, што, нават, у людзей, якія ў свой час не цураліся беларускай мо-вы, узнікла патрэба ў тлумачэнні іх сэнсу. Тыя, хто толькі меў стасункі з беларускаю моваю ў школе ды чуў яе з вуснаў дыктараў рэспубліканскага радыё, увогуле разгубіліся, бо сэнс іншых слоў і выказванняў быў для іх увогуле не зразумелы. Ім неабходна было тлумачыць што значыць "адабраць жывасілам" ці "заўзятар". І яшчэ што азначаюць такія словы, як "бажніца, колькігадовы, найважнейшы чыннік, наступнік, няўцям, з пункту гледзішча, векавечны, згрувашчанне, ускараскацца, лячэбня, лякарня, выпетраны, дыхтоўная праца, кшталт, фундацыя, маладзён, маладзёвы, ручма, жанімства, калямежавы стан, мазгаўня."

Я наўмысна прывёў тут не надта мудрагелістыя словы, якія могуць запатрабаваць спецыяльных ведаў у нейкай дысцыпліне, але звычайны зрусіфікаваны беларус і тут хоча мець тлумачэнне.

Усе гэтыя дый шматлікія іншыя словы на маю думку можна падзяліць на некалькі груповак: архаізмы, гістарызмы, выведзеныя з ужытку пад час русіфікацыі ды вярнўшыяся зараз, запазычаныя з польскай мовы ды новаўтвораныя. Магчыма гэта штучнае дзяленне, але ва ўсякім разе яно дае магчымасць лепш зразумець сэнс саміх словаў.

Каб патлумачыць свае меркаванні выкажу некалькі думак наконт словаў запазычаных з польскай мовы ды новаўтворанных. Уплыў польскай мовы адчуваўся і раней; некалькі стагоддзяў назад, "дзякуючы" спальшчонай шляхце і касцёлу. Зараз гэтая з'ява носіць зусім іншы характар. У супраціў русіфікацыі, без пэўнага ведання беларускай мовы з надзеяю здабыць якое беларускае слова шмат хто з нас адшуквае там падабенства і прымае на веру за сваё, роднае. Чаго варта ўжыванне такога слова, як **выкшталцонасць**.

Дарэчы, не толькі польскія словы зноў сталі папаўняць наш моўны ўжытак. Мы не прамінулі зрабіць запазычанасць і ў іншых братніх народаў. Як прыклад, аголіваць. Калі казаць папраўдзе, дык моўныя запазычаннасці, як і новаўтварэнні здзяйснялі канкрэтныя людзі. Потым ужо іх пераймалі іншыя. Бадай што з самых удалых новаўведзеных словаў гэта "маладзёвы".

А ўвогуле, акрамя апантаных памкненняў у гэтым накірунку прыхільнікаў роднага слова павінна існаваць меркаванне навукоўцаў. А каб мы, простыя абывацелі, змаглі штосці ўсвядоміць, нам усім неабходны "Слоўнік сучаснай беларускай літаратурнай мовы", які ўлічыў бы ўсе адроджаныя і новаўведзеныя словы.

Яззп Палубятка.

Павел Сцяцко
доктар філалагічных навук, прафесар

"З чужой моўнай практыкі..."

Перачытваючы напісаннае знакамітым Я. Скрыганом, яшчэ раз пераконваешся: як тонка адчуваў роднае слова з яго дзівоснымі нюансамі гэты пісьменнік! Шмат надзённага ў яго развагах пра мову маладых пісьменнікаў, пра пэўную недасканальнасць мовы іх твораў, дзе на месцы натуральных беларускіх словаў неапраўдана ўжываюцца "пазычаныя з чужой моўнай практыкі" (Гл.:Янка Скрыган. Ранішнія росы. Мн.,1965.с.168, а таксама 171 і інш).

"У літаратурнай практыцы,— пісаў Я. Скрыган,—усё больш мы прывыкаем да падмены слоў...на такія, што не ўласцівы беларускай мове... Часамі гэта робіца ад таго, што мы проста не ведаем мовы. І не дбаем аб яе культуры."

А пры панаванні ідэалогіі на найхутчэйшае "зліццё" моваў гэта якраз падтрымлівалася. Адсюль на месцы нармаванае беларускае літаратурнае мовы ўзнікала штучная сумесь— моўная трасянка з элементаў беларускае і расейскае моваў.

Пад час падрыхтоўкі Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы і двухтомавага "Беларуска-рускага слоўніка" нямала такіх словаў "з чужой моўнай практыкі" трапіла на старонкі згаданых даведнікаў. Пры абвяшчэнні нашай Бацькаўшчыны назалежнай дзяржавай—Рэспублікай Беларусь паўстала вострая патрэба адрадзіць беларускую нацыянальную мову. Праблеме моўнага адраджэння прысвечана нямала артыкулаў і практычных рэкамендацыяў беларускіх мовазнаўцаў і пісьменнікаў. Але тэма гэтая яшчэ патрабуе многіх і многіх высілкаў. І, менавіта, на старонках рэспубліканскай газеты Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны і варта актыўна абмяркоўваць надзённыя пытанні адраджэння і нармавання беларускай мовы. Прапаную чытачам "Нашага Слова" чарговыя нарысы гэтага кшталу.

Квяцістая капуста, а не цвятная.

"Русско-белорусский словарь" 1953 года, фіксуючы натуральныя беларускія адпаведнікі да расейскіх словаў з коранем цвет - : кветка, кветнік, кветачніца, кветкавы і інш. - разам з тым падае і такое: "Цветная капуста - цвятная капуста" (С.750). Гэтая недарэчнасць паўтараецца і ў іншых акадэмічных слоўніках. Між тым у "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" (Т.2.Мн., 1978. С.633) чытаем: "Цвятная капуста - асобы від капусты, суквецце якой ідзе ў ежу". У гэтым азначэнні, як бачым, гаворка ідзе пра кветкі (суквецце), якія ідуць у ежу. Значыць, у аснове намінацыі мусіць быць корань - ***квет*** - і натуральны тэрмін квацістая капуста (а не цвятная). Гэта пацвярждае і апісанне значэння прыметніка квацісты - " з вялікай колькасцю кветак, пакрыты кветкамі" (Тамсама, с.679).

Невыпадкова ў "Русско-белорусском словаре" 1993 года ўжо бачым: "Цветная капуста - квацістая капуста" (Т.3.С.701). Выкарыстаны гэты тэрмін і ў спецыяльным даведніку "Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі" (Мн.,1994.С.159), дзе ў артыкуле "Капуста" чытаем: "Капуста цветная - капуста квацістая". На жаль, на с.594 даведніка бачым і гэтае штучнае "Цветная капуста - цвятная капуста", безаглядна перанесеннае сюды з ранейшых акадэмічных слоўнікаў. Але ж яно пярэчыць іншым утварэнням з гэтым коранем ***квет*** - як адпаведнікаў рас. цвет - : квецень - цветень, кветкавы - цветковый, кветнік - цветник, Кветнікавы - цветниковый, кветкаед - цветоед, кветка - цветок і пад.

Расейскае слова цветной мае наступныя натуральныя беларускія адпаведнікі: І. каляровы; цветное кино - каляровае кіно, цветные металлы - каляровыя металы; 2. квацісты; цветная капуста - квацістая капуста" (РБС - 93.Т.3. С.701).

З аналізу відаць: нармаваным ёсць тэрмін *квацістая капуста* (а не цветная), што ў поўнай згодзе з семантычнай і словаўтваральнай структурай гэтага слова.

Удачкаваць, удачкаванне - а не удачарыць, удачарэнне.

Слова "удачарыць" утворанае ад асновы - дочер - (удочер-и-ть). Беларуская мова такой словаўтваральнай асновы не мае. Расейскаму дочь (дочери) адпавядае беларускае дачка (дочкі), ад асновы гэтага слова і вытворныя: даччын (з чаргаваннем к/ч) - рас. дочерний; даччыная фірма - дочерняя фирма. Таму і лексемам удочерить„ удочерение адпавядаюць натуральныя беларускія удачкаваць, удачкаванне. Іх выкарыстоўвае сучасны беларускі друк: Маленькую Марыську удачкавалі суседзі (ЛіМ.17.08. 1996) . 13-гадовай Г.М.Прусак гаспадары хрысціяне паабяцалі ўдачкаванне (Гарадзенскія запісы. Старонкі гісторыі і культуры. Вып.№ Гродна, 1997.С.81).

А вось нашыя слоўнікі падаюць толькі "ўсесаюзнае": удочерить - удачарыць, удочерение - удачарэнне; удочеренный - удачароны, удочеряться - удачарацца. Гэта значыцьь, у абедзвюх частках слоўніка тое самае, без перакладу, толькі напісанае з улікам свае фанетыкі і правапісу. Штучнасць для беларускай мовы згаданых словаў яскрава відаць з апісання іх значэння ў тлумачальных слоўніках.

Так , у томе пятым (кгіга 1.) "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы" (Мн., 1983.С.618) чытаем: "Удачарыць, зак. Прыняць у сваю сям'ю дзяўчынку на правах роднай дачкі". З гэтага тлумачэння і вынікае натуральнае - ад дачка (на правах дачкі") - удачкаваць, а не ўдачарыць, якое не мае свае словаўтваральнае асновы ў беларускай мове.

Ад удачкаваць - і натуральны назоў асобы: удачкавальнік. удачкавальніца, " той (тая), хто ўдачкоўвае - прымае ў сваю сям'ю дзяўчынку на правах роднай дачкі".

Такую ж натуральную словаўтваральную будову мусіць мець і намінацыя асобы , якая прымае ў сваю сям'ю хлопчыка на правах роднага сына, - усынаўляльнік, утварэнне з суфіксам - льнік ад асновы дзеяслова: Усынаўля(-ць)+-льнік (як і удачкава-льнік). Між тым у слоўніках і тут замест свайго тэрміна падаецца ўсесаюзнае ўсына-віцель - пазычаннае з расейскай мовы (усыновитель). Але ж расейскамоўным утварэнням з суфіксам - тель у беларускай мове звычайна адпавядаюць словы на -льнік: Наниматель - наймальнік, собиратель - збіральнік, повествователь - апавядальнік, метатель - кідальнік і г.д. У "Русско-белорусском словаре " 1982 года пад рэдакцыяй акадэміка К. Крапівы 294 беларускія адпаведнікі расейскіх словаў на - тель маюць суфікс - льнік. І нават у пазычаннях з расейскае мовы - тель замяняецца на - льнік. Параўн. соискатель - саіскальнік. Апошнім часам з гэтым суфіксам - льнік створаны ўласна-беларускі адпаведнік яго - спашукальнік, што таксама пацвярджае высокую прадукцыйнасць словаўтваральнага сродку - льнік у сучаснай беларускай літаратурнай мове і неўласцівасць ёй суфікса - цель.

Гатэль - а не атэль.

Слова гатэль - пазычана з французскае мовы; фр. hotel ад лацінскага hospitale "прытулак" (Макс Фасмер. Этимологический словарь русского языка. Перевод с немецкого и дополнения О.Н. Трубачева. Т.3.М., 1971 С. 170). У беларускай мове яно замацоўваецца ў форме гатэль як вынік транслітарацыі пазычанага слова: hotel - гатель; параўн. гісторыя, гайда і інш., якія ў расейскай мове не маюць пачатковага прыдыхальнага гука: атель, история, айда. Набыло пашырэнне ў выкарыстанні гэтае слова апошнім часам не без уплыву заходнеславянскіх і ўкраінскай моваў, якія таксама маюць літару (гук) г (h): польск. hotel, чэшск. hotel, украінск. готель. Не выпадкова сучасны друк выкарыстоўвае згаданую лексему - сінонім да наймення гасцініца - менавіта ў форме гатэль, а не той, якую фіксуюць акадэмічныя слоўнікі: "Отель м. атэль, гасцініца" (РБС-82. Т.І.С.623).

У часопісе "Полымя" (1997. №9. С.209) чытаем: "Усе тыя дні мы жылі з ім (М.Танкам) у адным нумары гатэля" (Мікола Аўрамчык. Шчодрасць паэзіі. Успаміны). У артыкуле вядомай пераклад-чыцы з беларускай мовы на аглійскую Веры Рыч "Замест шэйхаў - новыя рускія" (Свабода. 12 лютага 1997 г.) таксама бачым гатэль: "Гай Оўклі, адміністратар аднаго з лонданскіх гатэляў, сцвярджае, што практычна ўсе кліенты гатэля, запаўняючы рэгістрацыйную карту, пісалі гэтае слова - рускі".

Улічыўшы моўную практыку апошніх гадоў, "Русско-белорусский словарь" 1993 года падае ўжо і гэты варыянт слова : "Отель м. атэль, гатэль, гасцініца; отельный - атэльны, гасцінічны" (Т.2. С.387). Праўда, і тут перавага, як бачым, аддаецца ўсесаюзнаму стандарту атэль: яно на першым месцы, і вытворны прыметнік - толькі ад гэтае формы (атэльны).

Але ж маўленчая практыка і аналогія афармлення падобных іншамоўных словаў у беларукай мове сведчаць, што натуральнаю трэба лічыць толькі форму гатэль і прыметнік гатэлевы. А не штучнае атэль і атэльны, бо ў такім разе ("Каб было бліжэй да расейскай мовы" - К.Чорны) трэба ўжо пісаць "історыя", "айда", "эты" на месцы натуральных "гісторыя", "гайда", "гэты" і пад.

(Працяг у наступ. нумарах)

ПРЫНЯТУЮ ЛІТАРАТУРУ СПАЛЬВАЦЬ

(Заканчэнне.Пачатак у №4)

181.Капаевіч П. і Сяўрук М. — Літаратурная чытанка для вячэрніх школ 1-й ступені.ч.1-я. Менск. 1932г.
182.Карніенка. — Класавая барацьба на гістарычным фронце Беларусі. Менск.1932.
183.Капаевіч Павел. — Супраць капіталістаў і памешчыкаў. Менск. 1928.
184.Кабакоў і Лур'е. — Старонкі мінулага.Віц.ОСПС.1928г.
185.Купала Ян. — Том 1-шы. Менск.1928г.
186.Купала Ян. — 1918-1928гг. Творы. Менск.1930г.
187.Кіслякоў Ян. — Пасёлкі. Менск.1928г.
188.Крапіўніцкі М. — Па рэвзіі. Вільня. 1928г.
189."-" -- Пашыліся ў дурні. Вільня.1928г.
190.Клеймборт Л.М.— Маладая Беларусь. Менск.1928г.
191.Краязнаўства — Зборнік праграм і інструкцый краязнаўчай працы. Вып.І. Менск.1929г.
192.Кудзікаў С. -- За масавую і суцэльную калектывізацыю. Менск. 1930г.
193.Каганоўская. Ударная брыгада ў дзіцячым садзе. Менск. 1933г.
194.Кірыяка А. і Дружына Г. — Ад чаго залежыць ураджай. 1933г.
195.Каранёў В. — 200 пытанняў і адказаў па калгасным будаўніцтве. Менск.1931г.
196.Кніга. — Брыгадна-лабараторны метад у вузах і тэхнікумах. Выд. ДВС.1932г.
197."КП(б)Б у рэзалюцыях".— Выд. Партвыдавецтва.1934г.
198.Крачкоўскі. — Замак Любельскі. 1935г
198а. Кержанцаў П. і Ляонцьеў Л. — Азбука ленінізма. Вып.І. БДВ. Менск.1931г.
199.Лёсік Я. Усе кнігі.
200.Луцкевіч А. Усе кнігі.
201.Ластоўскі В. "-"
202.Ліхадзіеўскі С "-"
203.Літаратурны зборнік "Вольнай Беларусі".—Сшытак першы. Менск.1917г.
204.Лясны Рыгор. — Гістарычная праўда. Гарадно. 1923г.
205.Лесавік В. — Наша крыўда. Беласток.1921.
206 Ластаўка. — Выд. 1924г.
207.Ластаўкі В. - Падручны расійска-крыўскі(беларускі)слоўнік. Коўна.1924г.
208.Ліпілін І.В.— Як савецкая ўлада будуе новае жыццё. 1933г.
209.Лур'е. — Гандлёвы і пазыкавы капітал.(Палітэкано-мія). 1933г.
210.Лясны ЗМ. — Пра дні мінулыя. Выд. ДВБ.
211.Луцэвіч Ул. і Савёнак А. — Дашкольны спеўнік. Выд. ДВБ.1933г.
212.Маракоў В. Усе кнігі.
213. Мікуліч Б. "-"
214.Міцкевіч М. і Лёсік Я. — Як Мікіта бараніў сваіх. Менск.1917г.
215.Мыслінскі І.--"Обшчепонятая" мова. Менск. 1926г.
216.Мазур Ігнат.--Чырвоная Беларусь. Менск.1928г.
217.Мацярыкін М.С. –Асновы індустрылізацыі сельскай гаспадаркі БССР. Менск.1930г.
218.Маракоў. -- Права на зброю. Менск.
219.Міроп К.- Інструкцыя па ўліку лесакультурных работ у леспрамгасах БССР. Менск.1933г.
220.Матэрыялы па вывучэнню геалогіі і карысных выкапняў Беларусі.--Том VI.Выд.БАН.1933г.
221.Матэрыялы па вывучэнню геалогіі, гідралогіі і карысны выкапняў БССР.-Том VII.Выд.Бан.1933.
222.Матэрыялы да справаздачы Белкаапсаюза. - Выд.Белкаапсаюза 1934.
223.Мятліа.- Аб таварыстве беларускай школы. Выд.БАН.1932.
224.Малякоў Л.І. - Веццевы корм. Выд.ДВБ. 1932.
224а. Майзель Ю. і Шапавалаў М.- Кароткі нарыс гісторыі КП(б)Б.ДВБ.Менск.1929 г.
224б. Майзель.-1905-7гг.на Беларусі. Менск.
225. Некрашэвіч І.І. - Усе кнігі.
226."Наша ніва" - Зборнік, Вільня.1920.
227.Навіна Анг. - Жыдоўскае пытанне ў беларускай літаратуры. Вільня.1921.
228."-" - Пуцяводныя ідэі беларускае літаратуры. Вільня. 1921.
229.Народны прыгавор . - 1921.
230.Нацыянальнае пытанне і камуністычная партыя. -- Менск . 1924.
231.Некрашэвіч М.І. - Жыццё і праца. Менск. 1925.
232.Некрашэвіч С. - Лемантар. Менск. Усе выданні.
233."-" -Аб пашырэнні акання на чужаземныя словы.Менск
234. "-" - Роднае слова. Менск.
235. "-" - Расійска-беларускі слоўнік. Менск.1928.
236.Наша сіла - саюз.- Менск. 1926.
237.Некрашэвіч С. і Бузук П. - Праграма для збірання асаблівасцей беларускіх гаворак нераходных да суседніх моваў. Менск.1927.
238.Некрашэвіч. - Беларускі нацыянал-фашызм.
239.Нісневіч С. - Арганізавана правядзем другую бальшэвіцкую уборачную кампанію. Менск.1931.
240.Новасёлаў М. - Зямля расцвітае. (Пер.з рас.мовы) Менск.1932.
241.Остэрлёфт Вольдэмар і Шустэр Язэп. - Сусветная гісторыя. Вільня.1921.
242.Олікер і Розенблюм. - Нарысы па гісторыі комсомола БССР. Менск.1928.
243.Піваваравў З. Усе кнігі.
244.Пушча Я. "
245.Прышчэпаў Д. "
246. Пічэта У. "
247.Палонскі. - 10 чырвонаармейскіх песен. Изд.БВО.
248.Паўловіч Альберт. - Васількі П'еса. Вільня.1919.
249.Памяці Івана Луцкевіча. - Вільня.1920.
250.Парады закладчыкам спажывецкіх таварыстваў. - Вільня.1920.
251.Праграмы Беларускае Ніжэйшае Пачатковае Школы. Менск.1920.
252.Праграма Беларускай народнай партыі рэвалюцыянераўсоцыялістаў. Вільня.1920.
253.Праграма Беларускай партыі сацыялістаў - рэволюцыянераў. (праект).1920.
254.Праграма для гутарак па гісторыі роднага краю. Менск.1921.
255.Праграма па роднай мове . Менск. 1921.
256.Пятровіч І.А. - Усе кнігі.
257.Паўлінка. - Сялянская доля. 1921.
258.Паўловіч Альберт. - Снапок. Вільня.1921.
259.Прэч рукі ад нашай зямлі. 1921.
260.Пушкевіч Ю. - Лемантар для ўзросльх. Менск.1926.
261.Падгорны А. і Нікулін Я. - Палітграмата. Менск.1926.
262.Праца акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага праваліса і азбукі. - Менск.1927.
263.Паваротны. - Камсамольцы ў калгасе. Выд.1930.
264."-" - Камсамольскія вячоркі. Менск.1927.
265.Піотуховіч Міхал.- Францішак Скарына і яго літаратурная дзейнасць. Менск.1927.
266. "-" - Ля вытокаў лірыкі Янкі Купалы. Менск.1927.
267. "-" -- Паэтычнае светаадчуванне ў творчасці Якуба Коласа. Менск.1927.
268. "-" - Нарысы гісторыі Беларусі і літаратуры. ч.1-я.Менск 1928.
269.Працы Горы-Горацкага навуковага таварыства. Том. 1.Горкі.1928.
270.Працы Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта ў Менску.№16.-Педагагічны факультэт. Менск.1927.
271.Першы год працы БНД Інстытута і рабочы план працы на 1927-1928 год.(Складі Прышчэпаў,Гарэцкі і Думах). Менск.1927.
272.Прагасевіч Іван. - Рабочая кніга на беларускай мове. Сістэматычны курс марфалогіі і элемента сінтаксіса. Менск 1928.
273.Праект укладання слоўніка жывой беларускай мовы. Менск.1929.
274.Праваслаўны каляндар на 1929 год. Менск.1929.
275.Прохараў А.А. - Культура цукровых буракоў БССР. Менск.1930.
276.Прусліи. -1917 год у Полацку. Выд.1934.
277.Пікус, Жванскі, Баяровіч, Крывадубскі. - Памятка па арганізацыі севазварота ў прамысловасці і свінасоўгасах. Менск.1932.
278.Пеўзнер. - Грамадазнаўства. Менск. 1927.
279.Прымерны план работы. Выд. Аршанскага Райсовета Асоавіяхіма.
280.Пралеска Язэп. - Паноў трэба знішчаць гуртам. Выд. ДВБ.1933.
281.Петрайціс.- Лемантар. ДВБ.1931.
282 Пігулеўскі. - Кніга для чытання пасля лемантара.ДВБ. 1932.
283.Пастанова Цэнтр. Совета Асоавіяхіма па дакладу тав.Кузьнецова.- "Аб ходзе падрыхтоўкі і задачах новага вучэбнага году".1933 г.
283а."Полымя рэвалюцыі".Увесь камплект за 1934 год.
284.Пруднікаў

Алесь. - Зямныя зоры. Выд. ДВБ.ЛІМ.1932.
285.Рак-Міхайлоўскі С.- Усе кнігі.
286.Рак - Сімон. - Гутарка аб беларускай мове. Менск. 1919.
287.Радзевіч Л. - Пакрыўджаныя. (П'еса). Менск.
288."-" - Рэвалюцыйным шляхам. Менск. 1928.
289."-" - Сцэнічныя творы. 1921.
290."-" - Беларусь (Вершы). Вільня. 1922.
291."-" - Досвіткі. 1922.
292.Ракіта С. - Усе кнігі.
293.Рэўка С.- З - пад Барысава(Ф.Багушэвіч). Смык беларускі. Коўна.1922..
294.Равінскі М. - Зборнік песен з нотамі. Менск.1922.
295.Роднае слова. Менск. І і ІІ ч. Усе выданні.
296.Русак М. - Народны суд над сялянамі, запусціўшымі сваю гаспадарку. Менск. 1924.
297.Рэвалюцыя 1905 г. (Зборнік пад рэд.Ігнатоўскага і Я. Левіна. Менск. 1926.
298.Рудоміно Г. - Грамадазнаўства. Менск. Усе выданні.
299.Рудоміно Юры - Грамадазнаўства. Менск.
300.Рэкамендацыйны спіс літаратуры да XI гадавіны са дня смерці В.І.Леніна. Выданне Дзяржбібліятэкі.1935.
300а. Розенблюм. - Усе кнігі.
301.Смоліч А. - Усе кнігі.
302.Сташэўскі В. Усе кнігі.
303. Скрыган Я. "-"
304."Савецкае будаўніцтва". Журнал № 8-9. Выд. 1926.
305.Смоліч Аляксандра - Зорка. Беларуская граматыка. Вільня. Усе выданні.
306.Сучасны - П.С.Х. Фанэція на 1-ю дзею. Вільня.1923.
307.Сцэнічныя творы для дзіцячага тэатра. Вільня.1923.
308.Спекулянты беларускай душой.1921.
309.Станкевіч Янка.- Беларускі правапіс з практыкаваннямі. Вільня 1921.
310."-" - Правапіс чужых слоў. Вільня.1921.
311.Стыдна маўчаць і чакаць. 1921.
312.Сцэнічныя творы: Ц.Гартны - Соцыялістка. М.Кудзелька - Соне на балоце. Ф.Аляхновіч - Калісь, лес шумеў. Менск.1924.
313.Сваяк Казімір. - Мая ліра. (Вершы) .Вільня.1924.
314.Суліма - Здзехоўскі аб беларускай душы. Вільня.1924.
315.Самковіч У. і Пратасевіч І. - Родныя шляхі. Менск.
316.Слоўнік лясных тэрмінаў. Менск .1926.
317.Сцяпановіч Хв. - Родная мова ў комплекснай сістэме выкладання ў школе 1-га канцэнтра. Менск.1928.
318.Сцэнічныя творы. (Зборнік). Вільня. 1928.
319.Сержпутоўскі Аляксандр - Прымхі і забабоны беларускіх паляшукоў. Менск. 1930.
320.Сталевіч - Беларускі нацыянал-фашызм. 1930.
320а. Сілін Б. і Захараў. - як кашалі плесці. БДВ.1926.
321.Скрыпнік - Нацыянальнае пытанне ў праграме камінтэрну. Менск. 1930.
322.Слоўнік тэрміналогіі агульнае раслінагадоўлі. Менск.
323.Соя ў БССР. Менск. 1933.
324.Сіневока-Неразік - Рабочая кніга 3 год навучання. Ч.І і ІІ. ДВБ.1932.
325.17 год на варце соцыялізма. Брашура І.Іванова. Выд. БВО.1935.
326.Савецкая дэмакратыя. Зборнік. Выд.БелАН.
327.Салагуб - Лукішкі. Выд. 1932.
328.Сыцько В.М. - Крапытыка трацкісцкай тэорыі імперыялізму. Выд.БАН.1934.
328а. Сталін І.В. - Пытанні ленінізму. На белмове. Пераклад Яна Густыра. Белдзяржаўвыдавецтва. Менск.1931 г.
329.Таўбін Ю. - Усе кнігі.
330.1905 год у Беларусі.- Зборнік артыкулаў пад рэдакцыяй Шульмана. Менск. 1925 г.
331.Тарас на Парнасе. Менск. 1917.
332.Тарашкевіч Б. - Беларуская граматыка для школ. Вільня. Усе выданні.
333.Тарас Палясоўшчык. - Коўна. 1925.
334.Тутэйшы - Што дзяліць, а што не , каб супакой быў на свеце. 1920.
335.Тэраўскі Ул. - Беларускі спеўнік з нотамі на тры галасы паводле на родных мелодый. Менск.1921.
336.Тэраўскі Ул. - Беларускі лірнік.- Спеўнік на 4 галасы. Бэрлін.1922.
337.Туляневіч С. і Заяц П. - За лепшую сельскую гаспадарку і сельскагаспадарчы гурток. Менск.1926.
338.Указанні да праграм няпоўнай сярэдняй і сярэдняй школы (V-X класы).Кніга.БДВ.1934.Рэд.Лашчынскі.
339.Уліцын. - Суд над трохналёўкай. 1935. Менск 1926.
340."-" - За ўраджай. Менск.1929.
341."-"- Насенне, яго якасць і падрыхтоўка. Менск.1931.
342.Уладаў В. - Вытворчыя нарады ў калгасах. Менск.1931.
343.Уральскі - Зніштажэнне супроцьлегласці паміж горадам і вёскай. Выд. ДВБ.1933.
344.Фарботка Я. - Беларусь у песнях . Менск. 1920.
345.Хадыка Ул. - Усе кнігі.
346.Хто вінават. 1921.
347.Харламповіч П. - Пяцігоддзе дзяржаўнага музея. Менск.1927.
348.Халепа.- 14 год Кастрычніцкай рэвалюцыі.1931.
349.Хайтун. - Паходжанне і класавая сутнасць вялікадня. Менск. 1933.
350.Хрэстаматыя рэв. літаратуры Заходняй Беларусі. выд.БАН. 1933г. Пад рэд.Мятлы.
351.Цвікевіч А.І. - Усе кнігі.
352.Цвікевіч І.І. - Усе кнігі
353.Цэйтлін М. - Арганізацыя буйнай гаспадаркі ільнянога раёна. Менск.1931.
354.Чарот М. - Усе кнігі.
355.Чарняўская Л. - Дзіцячыя гульні. Вільня. 1919.
356.Чарняўшчынка Л. - Родны край. Менск. 1921.
357.Чаго чакаць беларусам ад Польшчы. 1921.
358.Чайко Г. - Вынікі масавых доследаў з угангеннямі на БССР. Менск. 1930.
359.Чарняўскі. - Яўрэйскі рабочы на зары рэв. руху. Менск. 1932.
360.Чарнушэвіч Н. - Дзіва. (Вершы). Менск. 1927.
361."Чтец". Зборнік Сярожнікава. ГІЗ.1926.
362.Шантыр Ф. - Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і самаазначэнне народа. Слуцк. 1918.
363.Што трэба ведаць кожнаму беларусу. Зборнік артыкулаў розных аўтараў: Міцкевіча. Лёсіка. Ластоўскага. Багдановіча і інш. 1918.
364.Ш. Рыгор. - Чаму-ж маўчыш, кабета сялянская? Бярэсце. 1921.
365.Шуляк І. - Вышэй галаву беларускі селянін. Пінск .1921.
366.Шлюбскі Ал. - Сябра інстытута беларускае культуры. Паны і сяляне ў палове XIX стагоддзя. Менск.
367.Шлюбскі Ал. - Бядуля. як этнограф. Менск. 1925.
368. "-" - Квашаніна. Віцебск. 1926.
369. "-" - Матэрыялы для вывучэння фальклора і віцебскае культуры. Менск.1927.
370.Шапавалаў М. - Скарына, яго дні ды друк на Бкеларусі. Менск. 1925.
371.Шэўчык і Саломенік. - Граматыка беларускі мовы. (Марфалогія і сінтаксіс).
372.Шыпіла І. - Што кожны селянін павінен ведаць аб каперацыі. 1925.
373.Шціпеўскі. - Беларуская Акадэмія Навук да ХУ-годдзя. Выд. БАН. 1934г.
374.Школьныя тэксты. Менск. 1927.
375.Шчакаціхін Мікола - Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Том І. Курганныя старажытнасці Беларусі . Менск. 1928.
376.Шатэрнік М. - Краёвы слоўнік Чэрвеншчыны. Менск.
377.Шанялевіч. - Беларуская мова. (Першы і другі год навучання). Менсмк.1933.
378.Шымянс. - Кніга для чытання .2-гі год навучання. Цэнтральнае выдавецтва СССР. 1931.
379. "-" - Кніга для чытання 4 год навучання. Ч.2.
380.Шчэрбакоў. - Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя. Менск. 1930г.
381.Э.Б. Што такое простая і што такое мудрэйшая гаворка. Вільня. 1920.
382.Ядвігін Ш. - Бярозка. Вільня. 1923.
383."-" - Чалавек. Хлеб. Баба. Заморскі звер. Пазыка. З маленькім білецікам.Вучоны бык. Што сказаў певень. Падласонкі. Рабы. Дачэсныя. (Апавяданні). менск.
384.Янчук Н.А. - Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Менск. 1922.
385.Ярашук Е.Л. Сувязь сялянскай гаспадаркі БССР з рынкам . Менск. 1926.
386.Якуб Колас у літаратурнай крытыцы. Менск. 1926.
387.Янка Купала ў літаратурнай крытыцы. Менск. 1928.
388.Якімовіч А. і гародкіна Е. - Чытанка для ІІ класа. ДВБ. Менск.1936

ДАДАТКОВАКАНФІСКУЮЦЦА:
1.Шчэрбакоў. - Нарыс гісторыі Беларусі Ч.І. Менск.1936.
2."-"- Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі. Менск.1934г.
3.Кернажыцкі. - Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі напярэдадні імпералістычнай вайны. БАН. Менск.1932г.
4."-"- Аграрная рэформа ў Бабруйскім старастве. Менск. 1930г.
5."-" - Гаспадарка рыгоннікаў на Беларусі. Менск. 1936г.
6.Кастрычнік на Беларусі. - Зборнік. Менск. 1927г.
7.Дудкоў Д. _ Сталыпінская рэформа ў Віцебскай губерніі. Менск.1931г.
8.Зборнік афіцыйных дакументаў у дапамогу масаваму настаўніку. Склалі Н. Левін і Хайфец. ДВБ.1934г.
9.Некрашэвіч А. - Чытанкі для ІІІ і IV кл. Выд. 1933,1934, 1935,1936гг. ДВБ. Менск.
420.Васіленко. - Хрэстаматыя на беларускай літаратуры для IX-X класа. Менск.ДВБ.1935г.
421.Бендэ. - Хрэстаматыя па Беларускай літаратуры для V,VI і VII класаў. выд. ДВБ. Менск.

ЛЁС

тых,хто паліў беларускія кнігі, а таксама іх папярэднікаў і настаўнікаў.

Наркомы - сілавікі БССР

(У дужках пазначаны гады, калі адпаведная асоба займала пасаду наркома)

ЧК - ГПУ - НКГБ - МГБ БССР

В.І. Яркін (7студз.-3 люг.1919г.)
У 1937 г. расстраляны
Я.К.Ольскі (сапр. Кулікоўскі) (кастр.1920 - студз.1923г.).
У 1936 г. расстраляны.
С.Ф.Пінталь (1923 -1924).
У 1937 г. расстраляны.
Ф.Д. Мядзведзь (1924). У 1937 г. расстраляны.
Р.А.Піляр (1925 - 1929). У 1937 г. расстраляны.
Г.Я. Рапапорт (снеж.1929 - сак.1931). У 1938 г. расстраляны.
Л.М. Закоўскі (сакр.Г.Э. Штубіс) (крас.1932-ліп.1934).
У 1938 г. расстраляны.
З ліпеня 1934 па люты 1941 г. органы дзяржбяспекі ўваходзілі ў Наркамат унутраных спраў БССР.

Л.Ф. Цанава (сакакік-ліпень 1941 г., чэрвень 1943 -лістапад 1951г.
У 1955 (12 кастрычніка) на дошыце ў Ляфортаўскай турме забіты паемерць.

Пад кіраўніцтвам Цанавы ў Беларусі знішчана некалькі сот тысяч чалавек.

НКВД -- МВД БССР.

С.В.Іваноў (1студз.-3 лютага 1919г.). У 1955 г. памёр па старасці.

З.І.Ангарэціс (сапр.Алекса) (люты-жнів.1919г.Літ.-Бел.ССР).
У 1940 г. расстраляны.

І.А.Адамовіч (пачатак 1921г.). У 1937 годзе скончыў жыццё самагубствам.

С.А. Мертэнс (1921г.). У 1937 г. расстраляны.

П.Д. Малаковіч (1922-1923). У 1937 г. расстраляны.

А.І. Хацкевіч (з1925г.). У 1937 г. расстраляны.

А.А. Сташэўскі (з 1926г.).

У 1938 г. расстраляны.

Р.А. Піляр (1929-1930). У 1937 г. расстраляны.

Г.Я. Рапапорт (1930г...) .У 1938 г. расстраляны.

Л.М. Закоўскі (сакр. Г.Э. Штубіс) (ліпень-снеж.1934г.). У 1938 г. расстраляны.

І.М. Ляплеўскі (снеж.1934-ліст. 1936г.). У 1938 г. расстраляны.

Г.А. Малчанаў (ліст.1936-люты 1937г.). У 1937 г. расстраляны.

Б.Д. Берман (сак.1937-трав. 1938г.). У 1939 г. расстраляны.

Пад патранажам Бермана ў нашай рэспубліцы было замучана - расстраляна не менш 100 тысяч чалавек. У адным толькі Менску пры ім было расстраляна 80 тысяч чалавек.

А.А. Наседкін (трав.-снеж. 1938 г.) у 1939 г. расстраляны.

А.Ф. Цанава (снеж.1938- ліп. 1941, чэрв.1943...). У 1955 г. пасля чарговага допыту памёр у турме.

С.С. Бельчанка (1944...) Дата смерці не ўстаноўлена.

Усяго было рэпрасавана каля 20 тысяч вайскоўцаў ЧК - НКВД. Гэта плата за тое, што яны адправілі на той свет з 1917 па 1959 год 66 мільёнаў 700 тысяч чалавек, у тым ліку амаль што ўсю беларускую літаратуру.

Паводле А.Шустоўскага

Р Э Х А

"Думаеце гэта здань? Можа і так", - сказаў Сільвэр, - але я не разумею аднаго.Мы ўсе чулі рэха. А хіба ж бачыў хто - небудзь,каб у зданяў быў цень? Дык адкуль тады ўзяцца рэху, калі не можа быць ценю?Не, хлопцы, так не бывае...

Р.Л.Стывенсан. Выспа скарбаў.

1.

Славуты аргумент Джона Сільвера успомніўся мне падчас чарговай спробы ўцяміць, што за нялад такі ў Беларускім каралеўстве, чаго ж бракуе нашай мілай Беларушчыне каб шырыца і заваёўваць прыхільнікаў, што замінае радаваць заўзятараў, якія жыць без яе не могуць, але часцяком з прыкрасцю адкладаюць газету ці кніжку замест таго, каб параіць яе сябрам і знаёмым. Раптам мяне ўразіла, менавіта Рэха і ёсць тая нястача. Маю я тут на ўвазе, вядома ж, не фізічную з'яву, але паводле падабенства той водгук, які мусіць мець кожная падзея, каб стацца падзеяй, кожнае слова, каб адчуць, што дайшло паводле прызначэння. Як асобу караля стварае атачэнне, так культурным і іншым справам дае выццё грамадскае Рэха, і для беларусаў гэта заўжды было праблемай. "Людзьмі звацца!", " - А хто там ідзе?", "Я ж ціха йграю, хто ж ціхіх прымеце", - ці гэта не прага водгукаў, ці не пошук рэакцыі атачэння?

Мне, аднак, карціць засяродзіцца на цяпершчыне, бо на мой погляд мы сёння пакутуем ад нястачы Рэха. Наймацней гэта б'е па тых, чые словы гінуць без знаку ў наваколлі, і выклікае шэраг хваравітых рэакцый, пачынаючы ад разгубленнасці і меланхоліі.

А часцяком чалавек не хоча адразу паддацца, пачынае завастраць фармулёўку, узнімаць голас, крычаць, вырабляць розныя штукі, каб прыцягнуць увагу. Як апафеёз гэтага я разглядаю "чачэнскую правакацыю" С. Дубаўца, які выдумаў адналасніцу, што нібы паехала ў Чачню снайперкай. Я схільны бачыць у гэтай неразважнай публікацыі акт адчаю. Што ж, прынамсі КДБ зацікавілася (калі, зноў жа, паверыць сп.Дубаўцу).

Сапраўднае, фізічнае рэха знікае, калі вакол крыніцы гуку пуста. Дзіўна ці не, але Ю.Станкевіч у "Крыніцы" прапанаваў менавіта такі выраз: Вялікая Інтэлектуальная Пустэча, што надзіва трапна перадае і разрэджанасць думкі, і поўную адсутнасць водгуку, і раз'яднанасць ды самоту тварцоў.

Яшчэ адным тыпам рэакцыі стала апошнім часам стварэнне штучнага рэха, або тэхнічнай мовай - рэберверацыі. "Наша Ніва" ў Інтэрнэце, "Ненажытая спадчына" і "Вострая брама" на "Свабодзе" - ўсё гэта, акрамя рэкламы, яшчэ і пошукі псіхалагічнага камфорту, штучнае запаўненне пустэчы. Дарэчы, пачытайце ў "Нашай Ніве" абвестку пра перадачу "Вострая брама" (дзе наўпрост на 90% чытаюцца артыкулы з "Нашай Нівы") і Вы ўбачыце сапраўдны хваласпеў Рэху - пад назвай Культурнага Кантэксту, Але не ў гэтым рэч - увачавідкі відаць, што натуральнага водгуку чамусці бракуе.

2.

Наўпроставым наступствам нястачы Рэха з'яўляецца, між іншым, страта творцамі пачуцця маштабу. Сталыя пункты параўнання (рэперы) стварае толькі жывая рэагавальная аўдыторыя. Інакш не могуць існаваць крытэрыі грамадскай вартасці і мастацкай якасці! Акцэнты незаўважна змяняюцца пад уплывам выпадковых чыннікаў, што дзейнічаюць у межах вузкага творчага кола і, непазбежная ў прынцыпе, неадпаведнасць паміж ім і адсэпараванай аўдыторыяй павялічваецца да непрыймальных памераў. Вельмі хутка гэта вядзе да дыспрапорцый, што робяць творчую прадукцыю ўсё менш цікавай. У нармальнай сітуацыі такія выпучэнні былі б хутка пастаўлены на вартае іх месца, але цяпер яны без перашкод набываюць статус творчых ды грамадскіх з'яў - і паспяхова адстрашваюць людзей ад беларускага слова.

Хачу адзначыць, што я ані ў якім разе не супраць індывідуалізму творцы. Па майму глыбокаму перакананню, толькі ён адпавядае сучасным сусветным стандартам. Але ва ўмовах гранічна паслабленнай зваротнай сувязі індывідуалізм развіваецца ў адстутнасці здаровых канкурэнцыі і ціску, і таму празмерна экспануюцца тыя бакі асобы, якія ў звычайным грамадстве былі б прыцененыя да нармальнага для людской супольнасці ўзроўню. А ў нас, маючы грамадства нават крыху больш кансерватыўнае, чым сярэдняя норма, назіраем такую "свабоду нораваў" сярод творцаў, якой пазайздросцяць найлібераль-нейшыя супольнасці.

Адсутнасць рэха запавольвае развіццё Беларушчыны, вядзе да страты кірунку, марнатраўства сіл і сродкаў, размывання мастацкасці і ў выніку - да страты культурным прадуктам спажывецкіх якасцяў.

Адчуваю, што неабходна падаць нейкія прыклады, не зважаючы на небяспеку пакрыўдзіць тых, хто будзе названы. Грэх супольны, таму названыя і неназваныя могуць самі вызначыць меру сваёй ангажаванасці. Так ці інакш, найяскравейшым прыкладам я лічу няўцямныя, але шматслоўныя размовы наконт постмадэрнізму. Прайшоўшы па розных выданнях на працягу доўгага часу, яны паспяхова пазбеглі і тлумачэння для шырокай аўдыторыі што такое постмадэрнізм і навошта пра яго гавораць. Прачытаўшы больш дзесяці публікацый, я не пабачыў ніводнае спробы зацікавіць чытача тым, што нібыта для яго друкуецца. Калі ж за чытача, як я разумею, пачынаюць змагацца, гэта часцяком больш нагадвае экстбіцыянізм, чым мастацтва. Цікаўным раю пачытаць Сл. Адамовіча, А.Глёбуса, Ул.Арлова - знойдзеце не адзін прыклад, як здэзарыентаваныя здольнасці даюць неадпаведны магчымасцям вынік.

З такога гледзішча заканамернай з'явай здаецца сцяна неразумення, што існуе паміж "ахопленнымі Беларушчынай" і "несазнацельным населеннем".

Бо каб пачаць хаця б чытаць па - беларуску чалавеку патрэбны стымул. Пакуль чалавек не зацікавіўся, ён не ведае, а таму і не улічвае і не паважае беларускія справы. Няма розгаласу - няма цікавасці - няма суперажывання.

Недзе пад Новы Год А.Дашкевіч урачыста абвясціў у "Нашай Ніве" пра супрэмацыю "беларускага культурнага прадукту". Ён лічыць, што сёння сапраўды культурны (ці прагны культуры) чалавек пачынае адчуваць перавагу беларускага. Мне пакуль што здаецца, што "беларускі прадукт" канкурэнтны толькі "сярод сваіх" . Я , шчыра кажучы, не бачу яшчэ такой спакусы, якая б прымусіла рускамоўных жыхароў Беларусі тлумна ісці да Беларушчыны каб, так бы мовячы, не адстаць ад жыцця. Так было ў свой час з творамі Караткевіча, дагэтуль здараецца - з творамі Быкава, але гэтага мала, каб выцягнуць цэлую культуру, пазбаўленую Рэха.

Якія пагрозы нясе існуючы стан спраў? Насуперак звычкам, прапаную звярнуцца да суседзяў. Польскі даследчык Павел Ясеніца піша цікавую для нас тэму ў эсэ "Польская анархія", аналізуючы прычыны згубы Рэчы Паспалітай у XVIII стагоддзі. Піша з забойчай дакладнасцю:

"... Так званы жыццёвы і палітычны рэалізм часам нагадвае слепату. Хворыя на яго людзі не заўважаюць відавочнага, таго менавіта, што гуманістыка ёсць магутнай сілай, здольнай займаць пазіцыі, абсалютна недасяжныя для палітыкаў, генералаў і тэхнакратаў. Таго, хто стварае і раздае культурныя каштоўнасці, паўсюдна цэняць . Такому народу лягчэй прабачаюць, дапамагаюць, цяжэй пагаждаюцца з ягонай крыўдай... . Свет прызвычаіўся лічыць, што ў краі надвіслянскім ды наднёманскім нічога вартага не паўстае. Калі ж можна без Польшчы абысціся ў культуры, дык гэтак жа лёгка можна і на палітычнай карце".

Каментарыі, лічу, непатрэбныя.

Фактычна,усё гэта вядзе нас да простай думкі:

Знешнія праявы гавораць пра нас тое, што развіццё Беларушчыны ідзе дрэнна і ў дрэнным кірунку, а гістарычны досвед тлумачыць, што вынікам такога стану будуць вялікія непрыемнасці.

3.

Чаму ўсё так адбываецца? Зноў суседзі прыходзяць на дапамогу:

" Імператыў самазахавання фармаваў асаблівасці нацыянальнага характару, які ў найагульнейшых рысах апісваецца мімікрыяй, пасіўнасцю, спецыфічным апартунізмам, скіраванымі на мінімізацыю рызыкі. Глыбейшыя, сутнасныя каштоўнасці шыфраваліся эмацыйнасцю і завостраным пачуццём роднага. У дарвінісцкім сэнсе наш народ быў ідэальна адаптаваны - але толькі для выжывання, не для развіцця. Калі ж гаварыць пра нацыю, гэта ненармальна і бесперспектыўна...

Аб'ектыўная, а можа і адзіная мера перспектыўнасці - вольны рынак сусветнай грамадскай думкі. Аблічча , якое мы дэманструем свету пераважна правінцыйнае. Тое, што гэта нам накінулі, не падлягае сумненню, але абставіны не адменяць факту... На вольным рынку толькі нехта сапраўдны знойдзе прызнанне, і ўсе спробы падмяніць сусветныя стандарты чымсці іншым - ці то асветаю, ці хатняю другаснасцю - сказаныя на няўдачу".

І яшчэ:

"... Ідэя украінскасці шмат для каго хутчэй выключае, чым уключае тое, што авангарднае, альбо элітарнае, альбо проста індывідуальнае. Пакуль гэта так, то гэтая грамада - не нацыя".

(Рыгор Грабовіч, дырэктар Украінскага Інстытуту пры Гарвардскім універсітэце, ЗША).

Напісана гэта было не сёння, і ўжо можа з дакладнасцю сказаць, што вызначаная панам Грабовічам задача пераарыентацыі эліты нацыі з парадыгмы выжывання да парадыгму развіцця на Беларусі не выкананая. З гэтай прычыны культура наша сёння ў стагнацыі, і менавіта культура, паймаваная ў шырокім сэнсе, і цягне сёння на дно беларускую справу. Гэта яе цана і значэнне, як напісаў пра тое Павел Ясеніца.

Вось такім уяўляецца мне сённяшні стан Беларушчыны і такую я бачу мэту, да якой мусім шукаць шляхі. Усё гэта нагадвае тыповую задачу з галіны менеджменту. Фірма мае вытворчы патэнцыял і перспектыўны рынак, але прадукцыя не прадаецца. Аналіз, выкананы намі, паказаў, што ў фірме няма сувязі паміж аддзеламі, і не ўлічваюцца пажаданні і думкі спажыўцоў. Маркетынгавае стратэгія цалкам заснавана на ўяўленнях асобных супрацоўнікаў без практычных даследаванняў.

Выснова - неабходная змена стратэгіі. Патрэбныя грунтоўнае вывучэнне патрэб рынку і каардынацыя падраздзяленняў, каб продаж аднаго тавару спрыяў поспеху другога.

Між іншым, пачаткі гэтага ёсць, наапрыклад у "Нашай Ніве". Мяркую, што і "Наша Слова" мусіць узяць на сябе частку гэтай справы, як трыбуна для інфармацыі, водгукаў, ацэнак і аналізу. У ідэале кожны арыгінальны твор, што з'яўляецца ў полі Беларушчыны, мусіць сустракаць некалькі публічных водгукаў:анонс, рэцэнзія, аналіз. Безумоўна, пакуль гэта чыстая мара. Але рацыянальная мара.

Альтэрнатыва вядомая: калі ў жывых твораў не з'яўляецца цені-водгукі, яны з жывых ператвараюцца ў здані.

Д.Жукоўскі, Гародня.

АПОВЕСЦЬ ПРА СЛОВЫ

Замак, замок, смык, слесар.

Старажытныя беларускія словы **замак** і **замок** трывала існуюць у нашай мове і ўзніклі амаль адначасова са з'яўленнем беларускай дзяржавы. Калі ў нас з'явіліся багатыя людзі, а разам з імі і злодзеі, што хацелі быць заможнымі не працуючы, то гаспадар мусіў зачыняць свае багацці ў куфэрку ці хаце на замок - спецыяльнае прыстасаванне для замыкання з дапамогай ключа. Потым гэта слова атрымала - іншыя вызначэнні; элемент архітэктурных каменных і драўляных кагструкцый і дэталь вогнястрэльнай зброі ды іншае, але мы больш падрабязна спынімся на першапачатковых яго значэннях.

Замок.

Прыстасаванне для замыкання на ключ чаго-небудзь (дзвярэй, куфэркаў, шафаў і г.д.). Пад час археалагічных раскопкаў найчастей сустракаюцца дзвярныя замкі і ключы да іх.

Дзвярныя замкі падзяляюцца на з'ёмныя (цыліндрычныя з "устаўной" дужкай і разыходнымі спружынамі, замкі з адкідной паўкруглай дужкай) і нерухомыя накладныя.



Замкі і ключы з Гародні XII-XVii ст.

Цыліндрычныя замкі існавалі з X да XV стст. Корпус цылiндрычнага замка звычайна аздабляўся насечкамі альбо напаянымі падоўжнымі ці кальцавымі палоскамі. Існавалі розныя тыпы цыліндрычных замкоў, прычым да кожнага тыпу замка вырабляўся адпаведны ключ.

У XVI ст. на змену цылiндрычным прыйшлі замкі з корпусам у выглядзе трохкутніка, чатырохвугольніка або шара. У канцы XVII ст. з'явіліся шрубавыя замкі. Сучасныя формы "рэпчатых" замкоў вядомы з XVШ ст.

Нерухомыя замкі падзяляюцца на камбінаваныя (з драўлянай засоўкай) і цэльнаметалічныя. Першы тып замкоў існаваў у XIV - XVI ст.ст. і меў ключы з гатычнымі элементамі. З другой паловы XVI ст. пашырыліся цэльнаметалічныя замкі з трубчатымі ключамі. З XVII ст. іх бародкі атрымалі выгляд перавёрнутай літары "Т". Да вырабаў , звязаных з замкамі варта аднесці замочныя лічыны, прычым некаторыя з іх мелі арнаментаванае аздабленне.



Ключ і замок з Мсціслава XVII-XVIII ст.

Існавалі таксама замкі, цалкам зробленныя з дрэва. Яны адчыняліся з дапамогаю спецыяльных каленчатых ключоў.

Замак

Замак з XI стагоддзя ў Еўропе - гэта ўмацаванае жыллё багатага чалавека (князя, караля, графа ці барона). Атрымаў назву ад слова "замок". Першапачаткова, ад таго, што дзверы і брамы замыкаліся на замкі ў адрозненні ад простых хатаў. Пазней замкі сталі замкамі ад зямель. Не ўзяўшы, не "адамкнуўшы" яго нельга было завалодаць краем ці нейкай тэрыторыяй.



Крэўскі замак. Рэканструкцыя І. Чарняўскага.

Алег Трусаў,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Беларускага універсітэта культуры.

Ад смыка да слесара

Зачапіўшыся за словы **"замак"** і **"замок"** нельга прайсці міма лінгвістычнага паходжання гэтых словаў. Замок, замкнуць, адамкнуць, замыкаць, прымыкаць, адмыкаць маюць агульны корань з апорай на зычныя м-к. Дзесьці ў гэтым корані адгадка паходжання слова замок. І яна не так глыбока. Ёсць старабеларускае слова "смыкаць", што абазначае: шчыпаць, абрываць, красці, цягаць, уцякаць. Слова "смыкнуць" - украсці, уцячы. У польскай мове слова "smykac" абазначае тое самае Польскае слова "smykalka" абазначае кемлівасць (па -расейскаму "смекалка"), якасць вельмі патрэбная злодзею.

Згадаем і словы **"смык"** , **"смычок" ад скрыпкі** і тое, што скрыпка інструмент шчыпковы. Смык шчыпае струны. Дарэчы, у беларусаў, як у сапраўднага еўрапейскага народа, была некалі свая нацыянальная скрыпка. Яна мела, праўда, усяго тры струны, але ў параўнанні з іншымі інструментамі гучала вельмі прыстойна. Гэтая скрыпка і называлася **смык**, а да смыка ўжо дапасоўваўся **смычок.**. Не лішнім будзе нагадаць што, калі Францішак Багушэвіч называў сваю другую кніжку "**Смык беларускі**"(першая была "Дудка беларуская"), то меў на ўвазе не смычок, а, менавіта, гэты трохструнны **смык**.

Згадаем і слова "**умыкнуць**" - украсці.

Такім чынам словы "**смыкаць**", "**умыкнуць**" абазначалі "ўкрасці", "адшчыпнуць" (таксама ўкрасці, але не ўсё), "уцячы". Супраць такіх дзеянняў трэба было **замыкаць**, вешаць **замок**. А ўжо пасля **адмыкаць**, для сябе .

Цалкам пацвярждаецца ўсё сказанае і аналізам таго ж гнязда словаў унямецкай мове. Das Schloss - замак і замок.Der Schlussel - ключ.Schliessen - зачыняць, замыкаць.Schleissen - шчыпаць.Паўтараецца ланцуг ад "шчыпаць" да "замка".

А пры чым тут слесар? А пры тым, што ў Германіі майстар якія ўмеў рабіць замкі (das Schloss) называўся па-нашаму замочнікам, а па-нямецку der Schlosser, адкуль і пайшло слова "слесар", распаўсюдзіўшыся павогул на майстроў па апрацоўцы розных металічных вырабаў.

Станіслаў Суднік.

Часовы выканаўца абавязкаў рэдактара Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.

Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.

Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.

Адрас для пашtовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, а/с 7.

Рэдакцыйная рада:
Генадзь Бураўкін — старшыня, Людміла Дзіцэвіч, Сяргей Запрудскі, Аляксей Пяткевіч, Аляксей Рагуля, Аляксей Саламонаў, Павел Сцяцко, Алег Трусаў, Эрнэст Ялугін.

Аўтары нясуць поўную адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі.

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі і друку Гродзенскага аблвыканкама.
231300, г. Ліда, вул. Ленінская, 23.
Кошт па дамове. Газета падпісана да друку 9 . 02 . 98 г.
Наклад 3500 асобнікаў. Замова № 463.